ААВЛ

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

***А.А. Корзюк***

# ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ КАНЦА XVIII – ПАЧАТКУ XX ст. У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНАЙ ШКОЛЕ

Репозиторий БГПУ

Рэкамендавана Вучэбна-метадычным аб'яднаннем
вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па педагагічнай
адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў
вышэйшых навучальных устаноў, якія навучаюцца па спецыяльнасцях:
1-020101 Гісторыя; 1-020102 Гісторыя. Дадатковая спецыяльнасць

Мінск 2010

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № УК 4721

УДК 947.6(07) «17/19»
ББК 63.3р
К666

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ,
рэкамендавана секцыяй грамадскіх навук (пратакол № 1 ад 03.02.10)

Рэцэнзенты:
доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры педагогікі вышэйшай школы і сучасных выхаваўчых тэхналогій БДПУ *В.А. Капранава*;
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры філасофіі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.А. Куляшова *В.М. Гірына*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *М.М. Сакалоў*;
метадыст Мінскага сувораўскага ваеннага вучылішча, выкладчык гісторыі і сацыяльна-палітычных дысцыплін вышэйшай катэгорыі *А.Т. Зямнова*

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук, прафесара *М.М. Забаўскага*

**Корзюк, А.А.**

К666 Вывучэнне гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст. у агульнаадукацыйнай школе : вучэб.-метад. дапам. / А.А. Корзюк; пад рэд. д-ра гіст. навук, праф. М.М. Забаўскага. – Мінск : БДПУ, 2010. – 152 с.
ISBN 978-985-541-004-2.

У дапаможніку разглядаюцца асаблівасці зместу вучэбнага матэрыялу па гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX ст., які вывучаецца ў IX класе агульнаадукацыйных устаноў. Аналізуюцца формы, метадычныя прыёмы і сродкі арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, што спрыяюць эфектыўнаму засваенню вучнямі зместу гістарычнай адукацыі. Прапанаваны тэарэтычна абгрунтаваныя метадычныя рэкамендацыі па вывучэнні асобных тэм курса і разнастайныя варыянты правядзення ўрокаў.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкам, настаўнікам школ, а таксама ўсім, хто цікавіцца пытаннямі выкладання гісторыі.

УДК 947.6(07) «17/19»
ББК 63.3р

ISBN 978-985-541-004-2

© Корзюк А.А., 2010
© БДПУ, 2010

БДПУ БІБЛІЯТЭКА
ІНВ. №

Рэпазіторый БДПУ

## УВОДЗІНЫ

Гістарычная адукацыя з'яўляецца адным з важнейшых фактараў фарміравання грамадзянскіх пачуццяў, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці навучэнцкай моладзі, забеспячэння ўстойлівага развіцця суверэннай беларускай дзяржавы. Гісторыя Беларусі як вучэбны прадмет з'яўляецца арганічнай часткай сучаснай адукацыйнай прасторы, спрыяе фарміраванню гістарычнай памяці і гістарычнай свядомасці школьнікаў. У адпаведнасці з асобасна арыентаванай парадыгмай сучаснай адукацыі, вывучэнне гісторыі як навучальнага прадмета арыентавана на фарміраванне ў вучняў якасцей асобы, неабходных для выканання агульных для ўсіх грамадзян Рэспублікі Беларусь сацыяльных функцый, абумоўленых сістэмай каштоўнасцей, агульнапрынятых у беларускім грамадстве.

Згодна з Канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі», мэтамі гістарычнай адукацыі з'яўляюцца авалоданне вучнямі сістэматызаванымі ведамі аб сусветным гістарычным працэсе і фарміраванне ўяўленняў пра месца Беларусі ў ім, далучэнне вучняў да дасягненняў айчыннай і сусветнай культуры, выхаванне сацыяльна актыўнай і творчай асобы, грамадзяніна і патрыёта сваёй Айчыны [1, с. 4].

Для рэалізацыі дадзенай мэты ў Адукацыйным стандарце вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі вызначаны наступныя задачы [2, с. 8]:

– засваенне вучнямі ведаў аб важнейшых падзеях, з'явах, працэсах, тэндэнцыях і заканамернасцях развіцця чалавечага грамадства ва ўсёй яго разнастайнасці і супярэчнасці;

– засваенне вучнямі асноўных гістарычных паняццяў;

– усведамленне вучнямі своеасаблівасці культур народаў свету, гістарычнага шляху і каштоўнасцей шматвяковай культуры беларускага народа;

– азнаямленне з жыццём і дзейнасцю, духоўнай спадчынай выдатных дзеячаў гісторыі, навукі і культуры;

– фарміраванне інтэлектуальных якасцей асобы, неабходных для пераўтваральнай і творчай пазнавальнай дзейнасці.

У Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Сусветная гісторыя. Гісторыя Беларусі» адзначаецца, што на ўзроўні агульнай базавай адукацыі сродкамі яго вывучэння фарміруецца нацыянальная ідэнтычнасць – канкрэтная эмацыянальна-псіхалагічная, палітыка-ідэалагічная і культурная пазіцыя асобы, якая праяўляецца ва ўспрыняцці і ідэнтэфікацыі сябе ў акаляючым свеце з пункта гледжання прадстаўніка беларускай нацыі,